ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Запісацца ў «Каралі дарог»**



**Адзін «клік», і ты мадэль**



**Калі маці — школьніца**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ЖНІЎНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 148 (28258)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# АГУРОЧНЫЯ САКРЭТЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка вёскі Святое Жлобінскага раёна Зінаіда Мікалаеўна КУТОЎСКАЯ кансервуе на зіму маладыя агурочкі са свайго агарода.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Людзі, якія бачаць праблемы і недахопы навакол і стараюцца вырашыць іх магчымымі спосабамі, у тым ліку і праз звароты ў органы ўлады, непасрэдна ўплываюць на парадак у нашым доме. Дзеля добрай справы часам яны пішуць адразу ва ўсе інстанцыі, з-за чаго ім, бывае, ляпяць кляймо «скаржніка». Аднак грамадзяне часта руняцца дзеля агульнага інтарэсу, і іх настойлівая ўвага прымушае ўлады прыкласці больш намаганняў для ліквідацыі праблемных момантаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9928 | ▲ |
| Еўра | 2,2331 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0298 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0803 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
16148
9 771990 763008

# АЛІМПІЙЦЫ ГАТОВЫЯ!

## Беларускі сцяг урачыста ўзняты ў алімпійскай вёсцы

**Цырымонія ўзняцця дзяржаўных сцягоў краін-удзельніц Алімпіяды-2016 прайшла ў Рыа-дэ-Жанэйра.**

Падобнае мерапрыемства заўсёды папярэднічае афіцыйнаму адкрыццю Гульняў і сімвалізуе гатоўнасць алімпійцаў краіны да ўдзелу ў спаборніцтвах.

СТАР. 3



■ Чалавек — чалавеку

# КЛУБ НА КОЛАХ,

## або Музыка з дастаўкай на дом

**Ёсць у Беларусі ціхія вёскі. Не носіцца там па вуліцах з лямантам дзятва, не гуляе моладзь, не гучаць песні. І толькі паціху дажываюць свой век састарэлыя людзі, часта адзінокія. Нават цяжка паверыць, што там, дзе сёння ўсяго сем жыхароў, раней было больш чым сто двароў. Але час ад часу нават глухія вёскі ажываюць, сюды вяртаецца музыка. Калі ў маланаселеных пунктах немагчыма стварыць дамы культуры, гэта яшчэ не азначае, што тамтэйшыя бабулі і дзядулі будуць жыць без свята. Аўтаклубы наведваюць нават тыя глыбінкі, дзе жыхароў можна пералічыць па пальцах рукі.**

Мабільныя ўстановы культуры пачалі актыўна ствараюцца ў межах праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Але не трэба лічыць аўтаклубы вынаходніцтвам нашага часу. І раней па Беларусі падарожнічалі падобныя ўстановы — жыхарам круцілі кіно, заезджыя артысты выступалі з канцэртамі... Сучасны клуб на колах можна параўнаць яшчэ і з сацыяльнай установай, бо адзінокім састарэлым людзям вельмі важна адчуваць увагу і падтрымку.

— Усю ноч не засну, буду вас успамінаць і дзецям патэлефаную, скажу, што я не адна — дзялілася жанчына, у вёску якой заехалі артысты.

І сапраўды такіх удзячных слухачоў, як у глыбінцы, яшчэ пашукаць трэба. Таму артысты ніколі не засмучаюцца, што працаваць даводзіцца ў палявых умовах і не такая ўжо вялікая ў іх публіка. Часам на лавачках і з дзясятак чалавек не набярэцца. Але песні будуць гучаць нават для аднаго-двух слухачоў.

Часта падчас сустрэч, арганізаваных аўтаклубам Бярозаўскага раёна, не тое што жанчыны, мужчыны выціраюць слёзы. Дзякуючы за ўвагу, за клопат і нават за вяртанне ў маладосць, калі ў іх вёсках раней людзі с песнямі бавілі вясёлыя вечары.

СТАР. 4